ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ’90 УНІВЕРСІТЭТ

ЧАЦВЕР
6
СНЕЖНЯ

№ 33(1662)

ОРГАН ПАРТКОМА,
РЭКТАРАТА,
КАМСАМОЛЬСКАГА
І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА
ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЧЫРВОНЫ РАДОК

Агу, будучыя палітыкі, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы! Адгукніцеся ліставаннямі на заклік Цэнтра вывучэння законаў развіцця грамадства сумесна распрацоўваць новыя палітычныя і эканамічныя канцэпцыі. Ваш брат — омскі студэнт чакае. Адрас: 644077 г. Омск-77, пр. Міру, 55 А. Омскі універсітэт. ЦВЗРГ.

* * *

Заўтра будуць прыняты асноўныя дакументы II Усесаюзнага семінару-нарады асацыіраваных навучальных устаноў ЮНЕСКА. У абмеркаванні іх удзельнічалі і прадстаўнікі нашага універсітэта.

* * *

Яшчэ на аднаго чалавека (раней іх было трое) вырас штат дактароў навук факультэта прыкладной матэматыкі. Нядаўна калегі па працы віншавалі (нават вывесілі «маланку») з абаронай доктарскай дысертацыі дацэнта кафедры метадаў аптымальнага кіравання Анатоля Іосіфавіча КАЛІНІНА. Яго ўзрост дае падставы сцвярджаць, што на факультэце назіраецца тэндэнцыя да амаладжэння доктарскіх кадраў.

* * *

Удзельнікаў фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Неруш» віталі нядаўна жыхары Капыльшчыны і Жодзеншчыны, дзе яны былі з гастрольнымі паездкамі.

* * *

Два дні «гасцяваў» на кафедры замежнай літаратуры філалагічнага факультэта прафесар Рыжскага універсітэта В. Я. Ібуліс. Гаспадары атрымалі ад яго неблагі падарунак — 8 лекцый і 6 кансультацый. Здаецца, Указ Прэзідэнта краіны, прадаставіўшы аўтаномію вышэйшым навучальным установам, ніколькі не абмежаваў іх супрацоўніцтва.



Шкада тых, кім завалодала раўнадушша. Напрыклад, да магчымасці сённяшнім надвор’ем пакупацца. Як, маючы яе, не пайсці ў басейн? Незразумела. Журфакаўцы яшчэ і спаборніцтвы наладзілі. Перамог трэцякурснік Ігар САКАЛОЎ (на здымку). А астатнія атрымалі задавальненне!

Фота С. ГРЫЦА.





РЭПЕТЫТАРСТВА Ў ЗАКОНЕ

СШ № 174 — звычайная школа ў сталічным мікрараёне Паўднёвы Захад. У мінулым годзе, у час выбараў у Вярхоўны Савет БССР, рэктар універсітэта Ф. М. Капуцкі, які балатаваўся тут кандыдатам у народныя дэпутаты, на сустрэчы з выбаршчыкамі паабяцаў адкрыць у ёй клас з паглыбленым вывучэннем хіміі. Слова сваё стрымаў. І выкладаць у двух класах — хіміка-біялагічным і фізіка-матэматычным — запрасіў супрацоўнікаў БДУ.

У школе, у сваю чаргу, ініцыятыву падтрымалі. Выкладчыкам далі поўную свабоду. Праўда, гэта не значыць, што працэс навучання не кантралюецца адміністрацыяй — выкладчык павінен вычытаць абавязковую колькасць гадзін. Усё астатняе — форма правядзення ўрокаў, змест лекцый — яго асабістая справа. Галоўнае — канчатковы вынік.

— Каб ён быў на ўзроўні, — расказвае старшы навуковы супрацоўнік хімічнага факультэта А. І. Урублеўскі,— асабіста я даю і патрабую ад вучняў больш, чым прадугледжвае школьная праграма. Некаторыя перасцерагаюць, маўляў, не кожнаму школьніку. гэта пад сілу. Аднак я ўпэўнены: няма такіх рэчаў, якія нельга растлумачыць.

За два гады (на працягу дзесятага і адзінаццатага класаў) А. І. Урублеўскі і яго калегі па эксперыменту абяцаюць цалкам падрыхтаваць школьнікаў да паступлення на адпаведныя спецыяльнасці ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Ды і сякі-такі падмурак для вучобы ў ВНУ ўжо закладваецца. А гэта нямала. Таму, думаю, мае рацыю Аляксандр Іванавіч і тыя выкладчыкі БДУ, што працуюць тут, прынёсшы ў ахвяру вучням свой час і сваё ўяўленне аб матэрыяльным дастатку (заробкамі ў школе асабліва не пахвалішся).

ПІНГ-ПОНГ

Сярод замежных студэнтаў ходзяць чуткі, што пасля Новага года кожны з нас павінен будзе індывідуальна ўносіць плату за вучобу, прычым, у валюце. Ці праўда гэта?

ГРУПА СТУДЭНТАЎ З РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА.

Толькі чуткі

Намеснік дэкана па рабоце з замежнымі студэнтамі У. А. ПАНКРАЦЕНКА афіцыйна сцвярджае, што ніякіх падстаў для хвалявання ў студэнтаў-замежнікаў няма. Фінансавыя пытанні, звязаныя з навучаннем у Савецкім Саюзе пасланцаў іншых краін, вырашаюцца ў адпаведнасці з пагадненнем аб планавай падрыхтоўцы спецыялістаў, якое падпісваецца прадстаўнікамі абодвух бакоў. Студэнты ніякага дачынення да гэтага не маюць.

Іншая справа, калі чалавек вырашыў вучыцца ў нас сам, без афіцыйнага накіравання. У такім выпадку ён падпісвае асабісты кантракт з універсітэтам. Вучоба ў «прыватным» парадку будзе каштаваць не мала: 1,5 тысячы долараў у год.

ПОЗІРК

З-ПАД БРЫВА

— І хто толькі прыдумаў гэты рамонт? — звычайна маўклівая бабулька-вахцёрша з геаграфічнага корпуса на гэты раз, здавалася, ніколі не выгаварыцца.— Грошы ж на вецер ляцяць. У мінулым годзе рамантавалі, зараз пановай пайшлі. А каму гэты разнабой патрэбен? Хіба прыгажосць якая ёсць: адно крыло калідора белае, другое — блакітнае, а хол наогул шэра-бура-малінавы робяць. Нехай бы лепш у аўдыторыі зазірнулі ды там рукі прыклалі.

Цяжка не пагадзіцца са словамі пажылай жанчыны. Крыўдна ёй, што на анучах для прыбіральшчыц эканомім, а тут такі размах. Не танна абыдзецца гэты «касметычны» рамонт універсітэту — каператывы (на гэты раз «Творца» — «Універсал» ужо натварыў) не прывыклі працаваць задарма. Дарэчы, наўрад ці гарантуючы пры гэтым якасць работ. Каб не давялося універсітэту праз год зноў прыватных будаўнікоў наймаць. Балазе вопыт у гэтай справе ёсць.

Каментарый загадчыка аддзела эксплуатацыі І. А. КАВАЛЕЎСКАГА:

— Калі зыходзіць з пазіцый: «Няма каўбасы і хлеба, навошта і прыгажосць», то сапраўды ўсё пачатае намі — непатрэбная справа. Але, ведаеце, ужо абрыдзелі гэтыя шэрыя, непрывабныя сцены, абшарпаная столь і сцёртая да чарнаты падлога.

Іншая справа, што рамантаваць даводзіцца даволі часта. Не паспее падсохнуць фарба, а студэнты ўжо пачынаюць ставіць на сценах свае аўтографы. Вельмі б не хацелася, каб такое здарылася і зараз. Сродкаў сапраўды пойдзе нямала — аддзелка 1 м² сцен штучным мармурам абыходзіцца універсітэту прыкладна 18 рублёў. Да Новага года мяркуем закончыць рамонт лесвічнай пляцоўкі і холаў усіх трох паверхаў геафака, гардэробаў, крыху паднавіць падлогу (прыспешвае нас і адкрыццё беларуска-нарвежскай школы экалогіі). Ужо ў наступным годзе плануем «заняцца» калідорамі, рамонтам дзвярэй і аўдыторый. Сродкі на «касметычны» рамонт у нас ёсць — штогод нам адпускаецца для гэтых мэт 550 тысяч рублёў.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

ШТО НОВАГА, НАВУКА?

ЦІ ПАЧНЕЦЦА ЗАЎТРА?

Менавіта складаная сацыяльна-палітычная абстаноўка ў краіне стала прычынай нешматлікасці ўдзельнікаў III тура Усесаюзнай алімпіяды «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс» па праграміраванню.

Калі звычайна за званне пераможцы змагалася больш дзесяці каманд, то зараз толькі сем саюзных рэспублік палічылі неабходным накіраваць у Мінск студэнтаў-праграмістаў. Кіраўнікі профільных ВНУ Прыбалтыкі, Малдовы, а таксама Масквы і Ленінграда праігнаравалі прапанову прыняць удзел у алімпіядзе.

Нягледзячы на ўсё, алімпіяда адбылася. Кожны з дзевятнаццаці ўдзельнікаў (прадстаўнікі сямі саюзных рэспублік) атрымаў па два заданні. Першае выконвалася ў пакетным рэжыме, другое — у класе персанальных камп’ютэраў. Усе заданні патрабавалі немалога напружання розуму, уважлівасці, а галоўнае — трывалай падрыхтоўкі. І калі ўладальнікі медалёў за першае і другое месцы вызначыліся без асаблівых цяжкасцей, то прэтэндэнты на трэцяе прымусілі журы паламаць галовы. Нялёгка было зрабіць выбар паміж І. Зісельманам (БССР) і К. Картымбаевым (Кіргізія). Давялося прагледзець і прааналізаваць складзеныя імі праграмы — і толькі тады вырашылі аддаць перавагу нашаму земляку.

Такім чынам, месцы сярод удзельнікаў размеркаваліся ў наступным парадку: А. Макагона (УССР) — першае, В. Тарасюк (УССР) — другое, І. Зісельман (БССР) — трэцяе. Пры падліку балаў каманднага першынства зборная Беларусі выйшла на другое месца, уступіўшы лаўры пераможцы ўкраінскім студэнтам. На трэцім — каманда Кіргізіі.

— Аналіз правядзення алімпіяды і яе вынікаў паказаў, што для павышэння ведаў студэнтаў у галіне інфарматыкі ва ўсіх ВНУ востра адчуваецца дэфіцыт сучаснай вылічальнай тэхнікі,— канстатуе справаздача аргкамісіі.

ШУКАЕМ ІСЦІНУ

І... БЕЗ ТАГО ХЛОПЦА

Наогул вячэрнікі на лёс не скардзяцца, не зважаючы на падвойны цяжар. За прывілеямі не ганяюцца, баставаць не прывучаны. Але тут пакрыўдзіліся: падалося, быццам «муштруюць» іх у войску за сябе і за таго хлопца, якому пашчасціла апынуцца на дзённым аддзяленні. Сапраўды, студэнтаў-вячэрнікаў ад выканання воінскага абавязку ніхто не вызваляў. Справядліва?

— Неабгрунтавана, — вымавілі-адрэзалі нядаўнія наведвальнікі рэдакцыі. — Стаўку трэба рабіць менавіта на нас — дзяржава не выкіне грошы на вецер. Абранай і на прадпрыемстве, і ва універсітэце спецыяльнасці мы не зрадзім. А колькі «дзённікаў» раней не вярталася пасля войска на родны факультэт? Свет пабачылі — перадумалі. Цяпер жа патэнцыяльныя дэзерціры ад ВНУ пераходзяць з курса на курс па інэрцыі, займаючы чыесьці месцы.

Вызначыць будучых злачынцаў значна цяжэй, чым падлічыць выкрытых. З тых, якія ў восемдзесят пятым годзе не вярнуліся на другі курс. Іх толькі пяць: два з мехмата, адзін з фізфака і два з геафака. Кропля ў моры. Ці варта яе прымаць за буру?

ФАКТ

Не праміне

ЧАРГОВУЮ ЛЕКЦЫЮ з цыкла «Драма чалавека ў люстэрку псіхааналізу». 12 снежня а 15-й гадзіне ў актавай зале галоўнага корпуса пойдзе гаворка пра кару XX стагоддзя — неўрозы і самазабойствы. Лектар паспрабуе адказаць на пытанні: «Ці ўсе мы звар’яцелыя або хто такі неўротык? Чаму мужчына зайздросціць жанчыне? Што такое абаронныя механізмы асобы? Ці можна сябе вылечыць».

Сэканомілі на анучах?

ДА ЮБІЛЕЮ УНІВЕРСІТЭТА

У ДВАЦЦАТЫХ МЫ ЎЖО БЫЛІ...

Дазвольце адрэкамендаваць: студэнты дваццатых. Паглядзеўшы фотаздымкі тых часоў, наўрад ці можна атрымаць уражанне, што яны былі за людзі — жывой размовы гэтым не заменіш. А так хочацца ведаць, з чаго складаўся кожны іх дзень, якія думкі і пачуцці іх наведвалі.

Паспрабуем хоць часткова запатоліць гэта жаданне з дапамогай тагачасных газет. Супрацоўнік універсітэцкага музея Сяргей СКВАРЧЭЎСКІ адшуквае ў беларускіх выданнях 20—30 гадоў усе ўпамінанні пра наш універсітэт. Мы плануем пазнаёміць вас з найбольш цікавымі з іх. Зразумела, што адной публікацыі для гэтага недастаткова, і сёння мы толькі пачынаем...

Тое, што засталося для нас невядомым пра іх — людзей 20—30-х — пэўна, яны і самі пра сябе не ведалі. Але ў нас ёсць надзея, што мы ўсё ж добра знаёмы з імі: гавораць, што людзі з таго часу не перамяніліся. І час, наш і іх, вельмі падобныя...

З раздзела «Паведамленні» газеты «Звезда» за 16 ліпеня 1927 года: ***«Заўтра будзе праведзена газаакурванне камсамольцаў БДУ. Збор у інтэрнаце па вул. Ленінскай у 10 гадзін раніцы».***

Газаакурванне — нам гэта ўжо невядома. Гэта від дэзінфекцыі. А «па масавасці ахопу насельніцтва» — як рэнтген сёння.

Мабыць, такія вось бытавыя падрабязнасці ілюструюць жыццё асабліва яскрава. І дазваляюць рабіць «жывыя» параўнанні. Цікава, ці можна сёння сустрэцца ў студэнцкіх інтэрнатах з такім выпадкам, аб якім напісала газета «Звезда» 18 верасня 1928 года? ***«У студэнта медфака БДУ выяўлена пад падушкай мыла, адзенне, мазі, кнігі, косці і кошык...»***

Між тым, паралелі «дзень мінулы — дзень сённяшні» часцей за ўсё выклікаюць здзіўленне па дзвюх прычынах — ці то з нагоды незвычайнага падабенства, ці то поўнай супрацьлегласці. Вось яскравы прыклад, у якім ёсць і тое, і другое. 5 снежня 1926 года студэнты універсітэта правялі дэманстрацыю. Пратэставалі супраць... Не, наадварот, «выказвалі ўдзячнасць партыі і ўраду за магчымасць вучыцца». Ці давядзецца трапіць на падобную дэманстрацыю цяперашнім студэнтам?..

У 1926 годзе пры факультэце права і гаспадаркі БДУ пачаў дзейнічаць кабінет па вывучэнню злачыннасці і хуліганства. Здаецца, зараз яго з'яўленне было б не менш своечасовым.

Таксама, як не зменшылася цікавасць да з'яўлення ў Беларускім універсітэце японскага паэта. У студзені 1927 года такі госць тут быў — Кадзува-Тава. Член КПЯ, палітычны эмігрант, але японскі паэт!

Цікавых выпадкаў з жыцця тых студэнтаў у газетах іх часу можна знайсці шмат. Вось у «Савецкай Беларусі» за 12 снежня 1926 года напісана: ***«Грамадзянка Р., якая скончыла педфак Мінскага універсітэта і атрымала месца настаўніцы рускай мовы ў Барысаве, зрабіла ў адной асабістай заяве 18 памылак у 15 радках...»***

Заметка «Святкаванне рэвалюцыі 1905 года», надрукаваная ў той жа газеце 20 снежня 1925 года, паведамляе, што ў гэты дзень на рабфаке універсітэта адбудзецца вечар, прысвечаны рэвалюцыі. У яго праграме — опера «Яўген Анегін»... па радыё, з Масквы.

Радыё выкарыстоўвалася тады і для чытання навуковых лекцый па праграме ВНУ. Заняткі гэтыя так і называліся — універсітэт па радыё.

«Ваенізацыя ў Беларускім дзяржаўным універсітэце» ідзе з вялікім размахам»,— сведчыць артыкул «Студэнцтва ваенізуецца», змешчаны ў «Звезде» 12 красавіка 1928 года. Студэнты бралі тады шэфства над кавалерыйскімі і іншымі ваеннымі палкамі, арганізоўвалі для чырвонаармейцаў гурткі.

Не адразу надалі пэўнае значэнне фізічнай культуры. У 1927 годзе ёю займалася толькі 6 працэнтаў універсітэцкіх студэнтаў. І толькі ў 1929 годзе фізкультура была ўведзена ў вучэбны план.

Магчыма, тым студэнтам было проста не да фізічных практыкаванняў — вельмі яны захапляліся палітыкай. Толькі на педагагічным факультэце БДУ толькі па ленінізму дзейнічала 10 (!) гурткоў. Усе камуністы і камсамольцы былі раздзелены на тры катэгорыі па палітычным развіцці, якія, у сваю чаргу, дзяліліся на групы (іх налічвалася 19). Кожная — з кансультантам-кіраўніком, кожная атрымлівала заданні і павінна была займацца самаадукацыяй. ***«Для прыцягнення жадаючых займацца беспартыйных не хапае кансультантаў-кіраўнікоў»,***— шкадуе аўтар артыкула ў «Звезде» за 12 мая 1927 года.

Шмат часу і сіл забірала ў студэнтаў «чыстка» ўласных радоў. З універсітэта выключаліся тыя, хто не падыходзіў «па класавым падборы»: дзеці гандляроў і папоў, царскіх афіцэраў і жандармаў, землеўладальнікаў і нэпманаў. Яны маглі трапіць у ВНУ толькі ўтаіўшы сваё сацыяльнае паходжанне, што яны і рабілі. Але, як правіла, падман потым раскрываўся. Газеты часта пісалі пра такія выпадкі...

Адрывачныя факты не ствараюць поўнага ўражання. Добрае дапаўненне да іх — лічбы, якія адлюстроўваюць нейкія агульныя тэндэнцыі. У 1927 годзе ва універсітэце было праведзена анкетаванне студэнтаў. Яго вынікі надрукавала «Савецкая Беларусь».

Па раздзелу анкеты «Матэрыяльнае становішча» — 15,3 працэнта студэнтаў адначасова працавалі і вучыліся; большая частка жыла на стыпендыю ў 19 рублёў і на сродкі ад выпадковых заробкаў; 8,5 працэнта — на сродкі бацькоў. У невялікім пакоі на трох чалавек жылі 37,1 працэнта студэнтаў, на чатыры—пяць — 26,6 працэнта; на шэсць — дзевяць — 17,5; на дзесяць — пятнаццаць і больш — 1,3 працэнты (18 чалавек). Акадэмічным заняткам удзялялі па шэсць—восем гадзін у дзень 41,1 працэнта, па дзевяць і больш — 28,2.

В. БЯГУН.

ЧАС. ЛЁС. ЖЫЦЦЕ.

Частка жахлівага ГУЛАГа

Было гэта вельмі даўно, семдзесят гадоў назад, калі наша краіна пачынала будаваць сацыялізм. Народныя масы шырока падтрымалі заклікі прыйшоўшых да ўлады бальшавікоў і ўпэўнена крочылі да ззяючых вяршынь светлай будучыні.

Але, натуральна, знайшлося і шмат палітычных праціўнікаў улады, якіх тагачаснае кіраўніцтва палічыла неабходным ізаліраваць у створанай сістэме канцлагераў, зон, дамзакаў.



Салавецкія астравы з пабудаваным там лагерам асобага прызначэння — частка велізарнай і магутнай сістэмы ГУЛАГа. З сярэдзіны 20-х гадоў сотні тысяч людзей атрымалі тут прапіску і смерць: эсэры, меньшавікі, кадэты, былыя царскія чыноўнікі і афіцэры, царкоўнікі, а з бегам часу, усё болей просты люд. Прыганялі этапамі за калючы дрот. Усіх, хто трапляў і мог трапіць пад ярлык «неблаганадзейны».

У ТРАЕЦКІМ ПРАДМЕСЦІ АДКРЫТА ВЫСТАЎКА «САЛАВЕЦКІЯ ЛАГЕРЫ АСОБАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ». ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЁ СЮДЫ НАВЕДВАЮЦЦА СТАЛЫЯ ЛЮДЗІ — ГЭТА Ж ЧАСТКА ІХ ЖЫЦЦЯ. А КАЛІ АБ ГЭТЫМ БУДЗЕ ВЕДАЦЬ І ПАМЯТАЦЬ МОЛАДЗЬ — НЕ ПАЎТОРЫЦЦА ТАКОЕ НІКОЛІ?

С. ВАСІЛЬЕЎ,
фота аўтара.

АДДЗЯЛЕННЕ

СУБЯЗІ

Пажар зласлівасці

Людзі зрабіліся нервовымі і зласлівымі. Каго вінаваціць у тым, што чарга за цукрам даўжынёю ў тры гадзіны? Каму паскардзіцца, што выкладчыку, аказваецца, не плоцяць за добрыя адносіны да студэнтаў? Такіх дробязей у кожнага з нас — вялікая скрыня, напоўненая даверху з дапамогай эканамічнага крызісу.

Чалавек прыходзіць у жыццё, каб зрабіць яго прыгажэйшым? Я ўпэўніваюся ў адваротным.

Традыцыйна да старых ставяцца з павагай і пашанай. Толькі не ў грамадскім транспарце!

Нядаўна пачалі мае савецкія суседзі па інтэрнаце цікавіцца сваёй гісторыяй. Шукаюць манускрыпты, пераглядаюць старыя часопісы. Але ў сваёй сям'і здольны адным словам, бы няўмольнай сякерай, перасекчы ланцужок, што аб'ядноўвае пакаленні. Маральная катастрофа ўжо не пагражае грамадству — яна безупынна адбываецца на нашых вачах. І ці не самі мы ў ёй павінны, калі не спяшаемся за вадой, каб загасіць пажар зласлівасці, а наўмысна варушым вуглі?

АМРАН.

SoS! SoS! SoS!

«01» спяшалася дарэмна

Чуткі, бы снежны камяк, абрасталі ўсё новымі падрабязнасцямі.

— Кажуць, студэнтаў з шостага паверха эвакуіравалі.

— Няўжо хто наўмысна кінуў гэты зласчасны пачак ад цыгарэт у электрашчыток?

Як звычайна, знаходзіліся нават людзі, якім усё вядома дакладна: ім адказны таварыш сказаў. А вось хто гэты «таварыш» — аказваецца, сакрэт.

Дык што ж здарылася на самой справе? Адказаць на гэта пытанне дапамаглі матэрыялы універсітэцкай камісіі (яе ўзначаліў галоўны інжынер А. К. Пякурын), якая правяла абследаванне месца ўзгарання электрычнага шчытка асвятлення на калідоры шостага паверху галоўнага корпуса.

...Пасля дванаццаці гадзін дня вахцёр адчула пах гарэлага. Не марудзячы, паведаміла аб гэтым інжынеру-электрыку А. П. Смірнову. Той дзейнічаў дакладна і аператыўна. Хуценька падняўся на шосты паверх і, праверыўшы электрашчыткі, у адным з іх заўважыў тлеючыя правады. Не чакаючы прыезду пажарнай каманды, адключыў ток. Хутка падаспела і падмога — ажно сем пажарных машын. Толькі рабіць ім ужо не было чаго — засталося толькі засыпаць адключаны электрашчыток.

Высвятляючы прычыны пажару, камісія прыйшла да высновы: адбыўся ён... з-за нашага бескультур'я. Хтосьці, праходзячы міма і ляпнуючыся данесці пачак ад цыгарэт да сметніка, сунуў яго ў шчыліну, балазе шчыток не зусім шчыльна прылягаў да сцяны. У выніку замыкання пачала тлець ізаляцыя.

«Слядоў полымя ці агню не заўважана. Матэрыяльны ўрон не нанесены».

З. АЛЯШКЕВІЧ.

ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

Жывіце ў крэдыт

Парадак давання крэдытаў сямейным студэнтам прадугледжаны Пастановай Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ ад 7 красавіка 1990 года № 330 «Аб дадатковых мерах па паляпшэнню матэрыяльна-бытавых умоў студэнтаў вышэйшых і навучэнцаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў», а таксама Інструктыўным пісьмом Праўлення Ашчаднага банка СССР ад 21 чэрвеня 1990 года № 120 «Аб крэдытаванні сямейных студэнтаў, якія вучацца ў вышэйшых навучальных установах з адрывам ад вытворчасці», у якім прадугледжана даваць пазыкі сямейным студэнтам, якія вучацца на трэцім і наступных курсах вышэйшых навучальных устаноў (ВНУ) у тым парадку, калі муж і жонка з'яўляюцца студэнтамі дзённага навучання.

Пазыкі можна даваць мужу ці жонцы ў размеры да 2000 рублёў на тэрмін да 10 гадоў з пагашэннем, пачынаючы з першага года працы пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы.

Крэдыты на ўказаную мэту даюцца ў парадку, устаноўленым інструкцыяй Дзяржбанка СССР ад 24 кастрычніка 1986 года № 20 «Аб доўгатэрміновым крэдытаванні і фінансаванні капітальных укладанняў насельніцтва» і наступнымі інструктыўнымі пісьмамі па пытаннях крэдытавання грамадзян з улікам наступных асаблівасцей.

Даванне пазык студэнтам робіцца наяўнымі грашыма пад асабістыя заявы-абавязацельствы пазычальнікаў аддзяленнем Ашчаднага банка СССР па месцы знаходжання ВНУ, у якім яны навучаюцца.

Для афармлення крэдыту пазычальнік павінен даць аддзяленню Ашчаднага банка СССР:

— заяву-абавязацельства;

— хадайніцтва рэктарата і грамадскіх арганізацый;

— пасведчанне аб шлюбе;

— пашпарт або дакумент, які яго замяшчае;

— паручыцельства аднаго або двух працаздольных грамадзян, якія маюць пастаянную крыніцу даходу;

— даведку аб заробку паручыцеляў;

— даведку з месца вучобы мужа (жонкі) аб тым, што ён (яна) не карыстаюцца ўказанай пазыкай.

За карыстанне крэдытам пазычальнік павінен выплачваць 3 працэнты гадавых, а за пратэрмінаваную запазычанасць з яго спаганяецца 4 працэнты гадавых. Па жаданню пазычальніка пагашэнне атрыманай пазыкі і працэнтаў па ёй можа рабіцца з наступнага квартала пасля атрымання крэдыту.

На падставе рашэння рэктарата і грамадскіх арганізацый ВНУ студэнту выдаецца хадайніцтва, у якім прадугледжваецца абавязацельства рэктарата ў дзесяцідзённы тэрмін паведаміць аддзяленню Ашчаднага банка, які даў пазыку, аб месцы будучай працы пазычальніка згодна з размеркаваннем або прадастаўленні акадэмічнага водпуску, пераводзе ў іншую ВНУ і г. д.

Аддзяленне Ашчаднага банка, якое дало пазыку, на падставе паведамлення аб месцы работы пазычальніка пералічвае запазычанасць па пазыцы ў аддзяленне Ашчаднага банка па месцу яго жыхарства (калі яно змянілася — па новаму месцу жыхарства) для наступнага пераафармлення заявы-абавязацельства з указаннем тэрмінаў пагашэння крэдыту.

Студэнт, якога адлічылі з ВНУ, пачынае пагашаць пазыку, якую ўзяў у Ашчадным банку, не пазней наступнага квартала пасля адлічэння з ВНУ.

У выпадку, калі студэнт, які скончыў ВНУ, не прыступіў да працы па якой-небудзь прычыне на працягу года, банк мае права датэрмінова спагнаць дадзеную яму пазыку прымусова або ўстанавіць пачатак пагашэння пасля сканчэння году з дня заканчэння ВНУ.

Калі пазычальнік не паведаміў аб новым месцы жыхарства і іншых зменах згодна з п. 2 заявы-абавязацельства сямейнага студэнта, а таксама не звярнуўся ў аддзяленне Ашчаднага банка для афармлення абавязацельства аб тэрмінах і парадку пагашэння атрыманай пазыкі, банк мае права датэрмінова спагнаць яе прымусова з даўжніка або з паручыцеля(яў).

СЛУЖБА 03

ЗАГАРТОЎВАЙЦЕСЯ САМІ

ЗАГАРТОЎВАННЕ — гэта комплекс мер, накіраваных на павышэнне супраціўляльнасці арганізма холаду, спякоце, сонечнай радыяцыі і іншым шкодным з'явам розных метэаралагічных фактараў. Яно садзейнічае развіццю і ўдасканаленню рэзервных магчымасцей арганізма. Перш чым прыступіць да заняткаў, патрэбна абавязкова параіцца з урачом, які дапаможа выбраць форму загартоўваючых працэдур, усталяваць працягласць і інтэнсіўнасць іх, а потым вызначыць эфектыўнасць.

Асноўныя гігіенічныя прынцыпы загартоўвання — сістэматычнасць, улік індывідуальных асаблівасцей арганізма, спалучэнне іх з пасільнымі формамі актыўнага руху, са здаровым ладам жыцця, абавязковы ўрачэбны кантроль і самакантроль.

Адрозніваюць загартоўваючыя працэдуры агульныя, калі ўздзеянню падлягае ўся паверхня цела, і мясцовыя, накіраваныя на загартоўванне асобных участкаў цела. Эфектыўна спалучаць і адны, і другія.

ЗАГАРТОЎВАННЕ ВАДОЙ

ВОДНЫЯ ПРАЦЭДУРЫ (абліванне, душ, купанне і інш.) аказваюць на арганізм механічнае ўздзеянне. Чым больш халодная вада, тым меншая працягласць працэдуры. Пачынаць загартоўванне патрэбна пры тэмпературы паветра 17—20°. Лепш прымаць водныя працэдуры раніцай, адразу пасля сну ці ранішняй зарадкі. Пачынаць загартоўванне пажадана з абцірання рушніком, губкай ці рукой (паслядоўна шыю, рукі, грудзі, спіну), потым выціраюць іх насуха і расціраюць рушніком да чырвані па ходу руху крыві да сэрца. Працягласць працэдуры не больш за пяць мінут. Першапачатковая тэмпература вады 33—34°, потым яе зніжаюць праз кожныя 3—4 дні на адзін градус і паступова (за 1,5—2 месяцы) даводзяць да 18—20° і ніжэй. У час працэдуры не павінна быць ніякіх непрыемных адчуванняў, дрыжыкаў.

Наступны этап — АБЛІВАННЕ. Пачатковая тэмпература вады — не ніжэй 30°, якую паступова патрэбна паніжаць не менш чым да 15°. Цела пасля працэдуры энергічна расціраюць рушніком. Працягласць працэдуры — 3—4 мінуты.

Яшчэ больш дзейсная працэдура — ДУШ. Тут спалучаюцца дзеянне халоднай вады і механічнае ўздзеянне струменя, што дае неблагі эфект.

Перш чым перайсці да халоднага душу патрэбна парада ўрача. Пачынаюць працэдуру пры тэмпературы вады 30—35°. Працягласць душу не больш за 1 мінуту. У далейшым тэмпература паступова зніжаецца, а час душу павялічваецца да 2-х мінут. Бадзёры настрой сведчыць аб станоўчым выніку. Пры пагаршэнні самаадчування ад працэдуры, як абліванне ступняў варта адмовіцца.

Нават такія простыя і даступныя працэдуры, і паласканне горла халоднай вадой, павышаюць устойлівасць арганізму. Яны асабліва карысныя людзям, якія пакутуюць хранічнымі захворваннямі дыхальных шляхоў. Абліваюць ступні штодзень перад сном на працягу ўсяго года. Пачатковая тэмпература вады 26—28°, якую праз кожны тыдзень зніжаюць на адзін-два градусы і даводзяць прыкладна на 12—15. Пасля аблівання ступні добра расціраюць да чырвані.

Рэкамендуюць таксама кантрасныя ванны для ног, калі іх папераменна 2—3 разы апускаюць то ў гарачую (пачатковая тэмпература 35°, якую потым даводзяць да 40—42°) на 2—3 мінуты, то ў халодную (пачатковая тэмпература вады — 20°, самая нізкая — 15).

Г. ГАЛЬЧАНЮК,
урач.

НУ І НУ!

Маладыя людзі з чатырох кантынентаў зямнога шара вучацца сёння ў БДУ.

Штогод больш чым шасцьсот студэнтаў у час летніх канікулаў мараць наведаць радзіму — атрымаць неабходны прыліў энергіі, зарад станоўчых эмоцый пры сустрэчы з роднымі і знаёмымі.

Але сёння нам ставяць палкі ў колы. Якім чынам?

Валютныя перашкоды

Нас у поўным сэнсе слова ашаламіла паведамленне, што прагучала нядаўна па радыё. Сутнасць яго у тым, што Міністэрства паветранага транспарту прыняло рашэнне аб продажы авіябілетаў на выезд за мяжу за валюту. Дзверы граніцы для многіх савецкіх людзей зачыняцца назаўсёды, калі гэта рашэнне ўступіць у сілу. Не лепш адчуюць сябе і замежныя студэнты, што вучацца ў Савецкім Саюзе. Можна зразумець урад вашай краіны, які з дапамогай такога кроку спрабуе папоўніць свае валютныя запасы. Толькі ці падумалі ў «вярхах», што гэта адмоўна адаб'ецца на якасці вучэбнага працэсу, бо доўгае растанне з радзімай наўрад ці спрыяе атрыманню выдатных ведаў. А дзе студэнту ўзяць валюту, каб хаця б тры разы за гады вучобы з'ездзіць дамоў?

АРЕШ.

«Брыльянты ад Некермана»

З'явіліся на свет вясной 1987 года, калі спявак і гітарыст Павел Кулакоў выйшаў з групы «Суседзі» з намерам стварыць уласны калектыў. Спачатку каманда звалася не менш экзатычна — «Дыяментавая брошка «№». Пасля змены назвы «Брыльянты ад Некермана» прымалі ўдзел у традыцыйных Ленінградскіх рок-фестывалях 1988 і 1989 гадоў, у штогадовым маскоўскім фестывалі нетрадыцыйнай музыкі «Сырок» (1989), фестывалі лаўрэатаў конкурса магнітаальбома часопіса «Аврора» (1989) і марафоне груп эксперыментальных напрамкаў «Новая музыка» (Ленінград, 1990). На адбыўшымся ў кастрычніку 1990 года штогадовым данецкім фестывалі «Формула 9» калектыў стаў лаўрэатам.

«Брыльянты ад Некермана» выконваюць музыку, якая ўяўляе сабой дзіўную сумесь лаціна-амерыканскіх і афрыканскіх рытмаў: ска, рэггей, фанк, соул, салса. Менавіта «Брыльянты», пастаянна эксперыментуючы і асімілюючы, здавалася б, чужыя рускаму слуху рытмы, з'явіліся заснавальнікамі новага напрамку і нарадзілі моду на негрыцянскую музыку.

Састаў групы:
Павел КУЛАКОЎ — вакал;
Уладзімір ШАПІРА — клавішныя, сінтэзатары;
Юрый СТАРАСЦІН — гітара, бэк-вакал;
Ігар КЛЯМЕНЦ'ЕЎ — бас, бэк-вакал;
Мікалай ДУНАЕЎСКІ — саксафон;
Сяргей БАРДЗІН — ударныя.
ДЫСКАГРАФІЯ: «Танцы над горадам» (1989), «Паперка ад цукеркі» (1990).

«Два самалёты»

У састаў групы, якая з'явілася ў 1987 годзе, увайшлі музыканты, да той пары вядомыя сваім супрацоўніцтвам з іншымі калектывамі Ленінградскага Рок-клуба (напрыклад, «Час кахаць» і «Брыльянты ад Некермана»). Два гады, насычаныя рэпетыцыямі і студыйнымі запісамі, далі плён: «Два самалёты» цалкам мяняюць імідж і музычную арыентацыю, адмаўляючыся ад тэкстаў на звыклай рускай мове і ўносячы ў танцавальную музыку рытмы рэггей.

З лёгкай рукі «Двух самалётаў» у Ленінградзе ўзнікла мода на афрыканскую і лаціна-амерыканскую музыку. Ска і рэггей, прыпраўленыя значнай доляй гумару і выконваемыя з невычэрпнай энергіяй — такая музыка групы.

Яе кампазіцыі ўжо паспелі пабыць у шырокім піцерскім радыёэпракаце. Музычныя ролікі групы трансліраваліся ў ТВ-шоу «50/50». У лістападзе 1990 года адна з песень «Двух самалётаў» фігуравала ў хіт-парадзе Ленінградскага тэлебачання «Топсакрэт».

САСТАЎ ГРУПЫ:
Вадзім ПАКРОЎСКІ — гітара, вакал, тэксты;
Антон БЯЛЯНКІН — бас, бэк-вакал;
Міхаіл СІНДАЛОЎСКІ — ударныя (экс-«Брыльянты ад Некермана»).
Аляксей МІХАЙЛАЎ — клавішныя (экс-«Брыльянты ад Некермана»).
ДЫСКАГРАФІЯ: «Звычайны ручны Чарокі» (1988), «Здарыцца з кожным» (1989).

«Павуціна»

Група «Павуціна», што спавядае гарманічны хард-рок, была створана ў 1988 годзе.

Узяўшы за аснову сваёй музыкі класічны хард-рок пачатку 70-х, узбагаціўшы яго элементамі арт-рока і надаўшы агульнаму гучанню моц і напор, які ўласцівы музыцы мінулага дзесяцігоддзя, музыканты дасягнулі непаўторнага саунда, выкрысталізаванага потым шматлікімі рэпетыцыямі.

Чыста стылістычна пошукі групы блізкія да таго пласта рока распрацоўкай якога займаецца канадская група «Раш».

У арсенале групы — запісаны ў 1989 годзе альбом «Крах», частка песень з якога падрыхтавана да выпуску ў 1990 годзе на вініле фірмы «Мелодыя», і дзве канцэртныя праграмы.

Паралельна з павышэннем тэхнікі ігры музыканты «Павуціны» надаюць увагу і дэталёвай распрацоўцы сцэнічнага іміджу групы. Дэкарацыі і піратэхнічныя эфекты — неад'емныя элементы канцэртных шоу саставу.

За час свайго існавання «Павуціна» была ўдзельнікам аднаго з буйнейшых рок-форумаў краіны — фестывалю лаўрэатаў конкурса магнітаальбомаў часопіса «Аврора» (1989, верасень), праграмы «Тры раунды ў стылі Хард-н-хэві», фестывалю «Белыя ночы рок-н-рола»; выступала ў шоу «Інтэршанс».

САСТАЎ ГРУПЫ:
Мікалай КУДРАЎЦАЎ — вакаліст, у голасе якога добра чуюцца блюзавыя інтанацыі з папраўкай на ўяжаранае гучанне групы;
Вячаслаў ШАМАЕЎ — клавішнік і бас-гітарыст у адной асобе, надзейны фундамент рытм-секцыі групы;
Сяргей ШАМАЕЎ — адзін з самых тэхнічных ударнікаў Ленінградскага рок-клуба;
Вадзім БЛЕЙЗІЗЕН — віртуоз, які ўражвае не толькі хуткасцю ігры, але і нестандартнасцю мыслення і захапляючым імправізацыйным сола;
Сяргей ЛЯПУНОЎ — піратэхнічныя эфекты;
Аляксандр ЛЯПУНОЎ — менеджэр групы.

«Духі»

«Адкрыццё-89» сярод спецыялістаў і крытыкаў»,— так пісала пра групу ў студзені 1990 года ленінградская газета «Смена», падводзячы вынікі папярэдняга музычнага сезона. Практычна за адзін год групе ўдалося заняць дастойнае месца ў піцерскай іерархіі рок-груп.

Музыка «Духаў» — гэта бард-рок, але з шырокім выкарыстаннем духавых інструментаў. Баян, які часта гучыць на іх канцэртах, лішні раз сведчыць аб народных каранях музыкі калектыву.

«Духі» паспяхова выступілі на традыцыйным, сёмым па ліку Ленінградскім рок-фестывалі; на рок-форуме лаўрэатаў конкурса часопіса «Аврора» (1989); музыка групы гучала ў вусных выпусках газеты «Смена».

САСТАЎ ГРУПЫ:
Міхаіл БАШАКОЎ, вакал, гітара;
Павел КВАША — саксафон, баян, бэк-вакал;
Міхаіл СУЛЫН — ударныя;
Валянцін ВАСІЛЬЕЎ — бас-гітара.
ДЫСКАГРАФІЯ: «Духі» (1989), «Шчасце» (1990).

ДАІ ПЕРАСЦЕРАГАЕ

Магло пашчасціць у апошні раз

Людзей на дарогах гіне ўсё больш і больш. Няўжо гэта натуральная кампенсацыя за рост колькасці насельніцтва?

У Мінску за 10 месяцаў бягучага года пацярпеўшых у дарожна-транспартных здарэннях на 60 больш, чым за гэты ж перыяд мінулага года, на 13 больш загінуўшых. У тым ліку траўміравана 75 і загінула 9 дзяцей.

Як і раней, значна большая частка дарожных інцыдэнтаў здараецца па віне пешаходаў.

За 22 дні лістапада ў Маскоўскім раёне горада зарэгістравана 12 дарожна-транспартных здарэнняў, якія пакінулі жахлівую «спадчыну» — дваіх загінуўшых і дзевяць параненых. Прычынай часцей за ўсё быў пераход праезнай часткі ва неўстаноўленых месцах. Асабліва небяспечным выявіў сябе праспект Дзяржынскага: за адзін толькі тыдзень у лістападзе на перасячэнні гэтага праспекта з вуліцай Голубева, з вуліцай К. Цэткін і з вуліцай Ясеніна загінула трое людзей, а на самім праспекце паранены сямігодак, які бегаў па яго праезнай частцы.

Паважаныя парушальнікі правілаў дарожнага руху з БДУ — Ігар Валер'евіч Казлоў, Уладзімір Іванавіч Варабей і Павел Аляксандравіч Міхалевіч! Мы віншуем вас, што не абярнуліся трагедыяй на гэты раз вашы парушэнні. Няхай вам заўсёды шчасціць заставацца на дарозе жывымі і здаровымі! Але лепш памятаць, што яна можа вытрываць не ўсіх рызыкуючых. Да таго ж, людзі гінуць сярод аўтамашын не толькі з прычыны павелічэння колькасці насельніцтва...

М. ДЗЕРГАЧОЎ,
дзяржаўтаінспектар
Маскоўскай ДАІ.

Зручнасці адмяняюцца

Менавіта так будзе пасля Новага года. Каб купіць звычайную паштоўку, вам давядзецца кіравацца на паштамт, таму што паштовае аддзяленне № 80, якое абслугоўвала універсітэт, з 1 студзеня 1991 года ліквідуецца. Усе аперацыі, звязаныя з атрыманнем і адпраўкай карэспандэнцыі, паштовых пераводаў, пасылак, з гэтага дня вы зможаце ажыццявіць на галоўпаштамце — у сэнсе адлегласці гэта бліжэй за ўсё.

ПАСПРАБУЕМ!

КАПЛЯ Ў МОРЫ

Сёння тут не так ужо і шматлюдна. Адны не зазіраюць да нас, бо не ведаюць аб існаванні такога аддзела, другія проста не надта імкнуцца нагружаць сябе і студэнтаў звыш праграмы. Але, упэўнена, той, хто хоць аднойчы супрацоўнічаў з аддзелам масавай работы бібліятэкі, зразумеў: з ім варта сябраваць.

Супрацоўнікі аддзела падрыхтуюць і правядуць агляд літаратуры на любую заказаную выкладчыкам тэму. Кнігі (часам яны маюцца ў сховішчы толькі ў адзіным экземпляры), пра якія пойдзе размова ў аглядзе, абавязкова будуць перададзены ў чытальную залу, і студэнт без асаблівых цяжкасцей зможа выкарыстаць іх пры падрыхтоўцы да лабараторных ці практычных заняткаў.

Накіруюць студэнтаў па правільнаму шляху ў вывучэнні той ці іншай тэмы і выстаўкі неабходнай для заняткаў літаратуры (асабліва зараз, калі вялікая ўвага ўдзяляецца самастойнай рабоце). Звычайна яны афармляюцца на другім і трэцім паверхах галоўнага корпуса. На іх прадстаўлены самыя новыя выданні, што паступаюць у бібліятэку. Менавіта такія вы ўбачыце на выстаўках «У дапамогу тым, хто вывучае палітычную гісторыю XX стагоддзя», «Літаратура па праграміраванню», «У дапамогу самастойнай рабоце студэнтаў», «У дапамогу тым, хто вывучае замежныя мовы». Праўда, каб выставачная літаратура не разыходзілася з «густам» выкладчыкаў, падбіраць яе пажадана па пададзеных імі спісах. Інакш можа здарыцца, што кнігі, так бы мовіць, будуць адарваныя ад жыцця. Каб пазбегнуць гэтага, варта наладзіць цесны кантакт: аддзел — кафедра. На жаль, пакуль некаторыя загадчыкі лічаць за лішняе карыстацца нашай дапамогай.

Мы прапануем завесці знаёмства з намі і арганізатарам культурна-масавай работы. За гады існавання аддзела (дарэчы, сёлета мы адзначым свой дзесяцігадовы юбілей) яго супрацоўнікі назапасілі багаты вопыт правядзення вечароў, сустрэч, дыспутаў, якім мы з ахвотай падзелімся з вамі. І не толькі вопытам, але і тымі метадычнымі распрацоўкамі, якіх у нас больш сотні, сцэнарыямі да правядзення свят, напрыклад, Новага года, 8 Сакавіка.

Безумоўна, калі мысліць маштабамі універсітэта, то работа аднаго аддзела — капля ў моры. Але і яна часам перапаўняе чашу.

С. ГРЫГОР'ЕВА,
загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі.

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

11 і 18 СНЕЖНЯ ў памяшканні Мінскага цырку адбудзецца ШОУ-ПАНАРАМА «САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ» Ленінградскага рок-клуба з удзелам названых груп. Панарама пашырае свае далягляды за кошт ГРАФІКІ кіраўніка ансамбля «Машыны часу» АНДРЭЯ МАКАРЭВІЧА, ФАТАГРАФІЙ АРКАДЗЯ БІРЫЛКІ, АНСАМБЛЯ РОК-МУЛЬТ ПАНТАМІМЫ, продажу кніг, грампласцінак, тавараў СП «Румітон». Даведкі па тэл. 236-762, 261-008. Арганізатар правядзення панарамы — агенства «МОСТ».

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ТЭАТРА

СПАЧАТКУ БЫЛА БАТЛЕЙКА...

Ролю казы выконваў хлопец. Яна з'яўлялася ў час святкавання каляд, прыгожа ўбраная — у воўне з рожкамі і нават з мордай. Гэта было нешта накшталт расхіннай кашулі з белага палатна, якая надзявалася на галаву, а зверху прымацоўваліся ўсе «знешнія атрыбуты» казы. Морду рабілі з дзвюх драўляных плашак, працягнутых вяроўкаю, што спускалася да іграючага, а ён торгаў яе і прымушаў плашкі шчоўкаць, быццам губы і зубы жывёлы...

Можа, гэта яшчэ нельга назваць тэатрам: хадзілі валачобнікі ды калядоўшчыкі па вёсках і мястэчках, з двара ў двор, велічаючы гаспадароў, выконвалі яны свой фальклор — з музыкай, з валынкай... Сцэнкі з казой у час каляд таксама яны разыгрывалі.

Скамарохі існавалі ў Беларусі з XII стагоддзя і захаваліся да XX стагоддзя. На вяселлях, народных ігрышчах яны заўсёды былі ў цэнтры ўвагі, ведалі шмат жартаў, ігравых дыялогаў, умелі добра спяваць, танцаваць, выкарыстоўвалі маскі, грым, своеасаблівае адзенне, ужывалі сцэнічныя эфекты. Скамарошыя прадстаўленні ў многім паслужылі асновай для стварэння рэпертуару беларускага тэатра — батлейкі.

Яна з'явілася на Беларусі недзе ў XVI стагоддзі, і звязана гэта было перш за ўсё з рэлігійным святам нараджэння Хрыста, а таксама ўсё з тымі ж калядамі. Шырокаму распаўсюджанню лялечнага тэатра садзейнічалі шкаляры і семінарысты, якія ў час канікулаў паказвалі сцэны «Нараджэнне Хрыста «Цар Ірад», інтэрмедыі школьнага тэатра.

Паступова батлейка перайшла ў рукі дробных рамеснікаў і сялян, што садзейнічала нараджэнню арыгінальнай драматургіі. У пастаноўках выкарыстоўвалася ўсё больш жывога фальклорнага матэрыялу — прымавак, бытавых анекдотаў, камічных сцэнак. Спектаклі лялечнага тэатра былі вельмі папулярныя, яны даваліся ў Мінску, Магілёве, Смаленску, Бабруйску, Гомелі, Баранавічах, Беразіно, Рэчыцы, Мазыры, Мсціславе, Ашмянах, Крычаве...

Батлеечныя прадстаўленні адбываліся ў спецыяльна зробленай скрыні накшталт сялянскай хаты, а часам з купалам і рознай колькасцю паверхаў. У асноўным на Беларусі было вядома шэсць відаў батлеек: аднапавярховыя (панарамныя); двухпавярховыя: з лялькамі, якія рухаліся, і кананічным афармленнем; двухпавярховыя са спецыяльнай вежкай батлейкі, пабудаваныя па прынцыпу ценявога тэатра; батлейкі з празрыстымі дэкарацыямі, якія мяняліся ў час спектакля; батлейкі-«зоркі».

Аднапавярховы лялечны тэатр нагадваў сабой хату з дахам, пярэдняя сцяна якой звычайна была палатнянай і паднімалася як заслона ў тэатры. У двухпавярховай батлейцы верхні ярус уяўляў «неба» і служыў для паказу біблейскіх сцэн. Для верхняга яруса было характэрна багатае і маляўнічае афармленне. Задняя сцяна батлейкі была распісана рознымі фігуркамі, у цэнтры размяшчалася высокая, абклееная «залатой» паперай паўкруглая арка, у глыбіні якой знаходзілася невялікае ўзвышэнне накшталт царкоўнага аналоя. З бакоў меліся дзве меншыя аркі, яны служылі ўваходам і выхадам для лялек. Менавіта ў двухпавярховай батлейцы захавалася сувязь з містэрыяльным тэатрам і характэрным для яго падзелам на «неба», «зямлю» — «рай» і «ад».

На ніжнім ярусе, які ўяўляў «зямлю» з палацам цара Ірада іграліся сцэнкі бытавога характару. Ён быў афармлены больш стрымана. Сцены былі пафарбаваны ў шэра-блакітны колер з наклеенымі з белай паперы аконнымі рамамі. У цэнтры стаяў трон цара Ірада ў выглядзе крэсла, такое ж крэсла стаяла і з левага боку. Уваход у пекла быў выкананы ў выглядзе галавы пачвары з выскаленымі зубамі.

Да трэцяга тыпу батлейкі адносіцца двухпавярховае збудаванне з вежай, падлога якой уяўляла вярчальны круг, дзе памяшчаліся лялькі.

Празрыстыя дэкарацыі пятага тыпу батлейкі выклікаюць асаблівую цікавасць, яны вельмі падобныя да дэкарацый сучаснага лялечнага тэатра. Такая батлейка існавала ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя і была характэрна толькі для Беларусі.

Нягледзячы на тое, што батлеечны тэатр прыйшоў да нас з Захаду, на Беларусі ён набыў чыста народны характар. У ім шырока выкарыстоўваліся вобразы і сцэны ў коле прывычных падзей сялянскага і гарадскога жыцця. Героямі прадстаўленняў звычайна былі персанажы, з якімі непасрэдна ў жыцці сустракаліся гледачы: купец, цыган, карчмар, мужык. У дэкарацыйным афармленні яскрава бачыліся нацыянальныя рысы. Невядомыя народныя майстры стварылі батлеечны тэатр у выглядзе невялікіх праваслаўных цэркваў і аздобілі афармленне абодвух ярусаў вынаходлівай разьбой і нацыянальным арнаментам.

Беларускія батлеечнікі былі сталярамі, разьбярамі і мастакамі. Яны самі будавалі батлейку майстравалі лялькі, шылі для іх адзенне, грыміравалі адпаведна характару вобраза, падбіралі атрыбуты, што вызначалі сацыяльнае становішча, характар персанажаў. Звычайна лялькі выразаліся з дрэва, касцюмы шыліся ці размалёўваліся адпаведна вобразу-характару.

Самай дасканалай была лялька цара Ірада. Ён уяўляў сабой сярэдніх гадоў мужчыну з непрыемным выразам твару, барада была чорная, шырокая, густыя чорныя вусы і чорныя доўгія простыя валасы даходзілі да плеч. На лбе і паміж броваў вырысоўваліся зморшчыны. На галаве шасцізубковая карона, абклееная «залатой» паперай. Рукі на шарнірах, у правай, сагнутай у локці, цар Ірад трымае бляшчаны скіпетр, левая была выцягнута ўперад. Апрануты ў доўгае простае адзенне з «залатой» парчы з шырокімі рукавамі.

У адзенні воіна цара ўжываліся пазалочаныя латы з шырокімі наплечнікамі і кароткая спадніца, у правай руцэ ён трымаў кап'е, у левай — круглы шчыт.

Лялька Смерць звычайна выразалася з дрэва і нагадвала шкілет. Яна трымала ў руках касу. Лялькі Антон з казой і Антоніха заўсёды былі апрануты ў беларускія касцюмы. Адзенне дзеючых асоб другой часткі спектакля, што адлюстроўвала тагачасную рэчаіснасць, увесь час змянялася адпаведна з модай, якая была характэрна для розных слаёў насельніцтва Беларусі.

(З артыкула П. Карнача «Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва», змешчанага ў шасцітомнай «Гісторыі беларускага мастацтва»).

ПЕРАЎВАСАБЛЕННЕ

Я бачу гукі!

Што ёсць чалавек — духоўнае ці матэрыяльнае? Аднойчы гэтае пытанне тупіковай сцяной паўстала перад заснавальнікам эўрытміі Рудольфам Штэйнерам. І не дазваляла супакоіцца, пакуль не авалодаў ён вычарпальнымі ведамі аб узаемадзеянні ў прыродзе чалавека двух процілеглых пачаткаў. Дзякуючы здольнасці Штэйнера да назірання за духоўнымі і душэўнымі працэсамі, якія адбываюцца ў целе чалавека, былі адкрыты ўзаемасувязі эмацыянальных працэсаў і моўных структур, што стала асновай для новага падыходу да мастацтва рухаў, новых форм жэстаў.

Любы знешні рух, калі ён не прадугледжаны знутры, будзе аўтаматычным, выпадковым ці нязграбным.

«Мова зыходзіць знутры чалавека, будуючыся па вызначаных законах. Такім жа чынам і душэўны свет можа выказаць сябе ў знешнім руху, у жэстах, што ўзвышаюцца да ўзроўню бачнай мовы. Па сваіх выразных магчымасцях такі рух падобны на слова ці спевы, якія гучаць. Гэтай бачнай для вачэй мове даступна перадаць усю паўнату чалавечай сутнасці, яго цела, яго душу, яго дух — вось прынцыпы, пакладзеныя ў аснову эўрытмічных рухаў Рудольфам Штэйнерам.

Дынамічнае развіццё заканамернасці структуры, душэўныя працэсы, якія хаваюцца за паэтычным словам ці музычнай інтанацыяй, эўрытмія трансфармуе ў жэст і робіць даступнымі ўспрыманню ў часе і прасторы. Яна — саўдзельніца ў тым, што некалі абумовіла жыццё мастацкага твору, законы і заканамернасці якога эўрытмія пераўтварае ў празрыстую і плаўную мову жэстаў і паказвае гледачу адзіным патокам руху.

З дапамогай эўрытміі кожны галосны і зычны гук набыў уласны жэст. Цэлая гама жэстаў адпавядае такім душэўным настроям, як радасць, іронія, смутак, пашана. Па таму ж прынцыпу аб'ектыўнай адпаведнасці знешняга ўнутранаму адбываецца і рух па сцэне.

Першыя эўрытмічныя пастаноўкі праходзілі ў Гетэануме (Швейцарыя). Тут упершыню адбылося эўрытмічнае чытанне «Фауста». І адразу было зразумела: эўрытміі падуладныя тыя сферы, якія былі найбольш цяжкімі для тэатральных пастановак,— сцэны з нябачнымі дзеючымі асобамі (анёламі, эльфамі, чарцямі). Магчыма, таму Штутгарцкі тэатр-студыя «Эўрытмеум», заснаваны ў 1923 годзе Рудольфам Штэйнерам і М. Я. Штэйнер-Сіверс, прывёз у Савецкі Саюз пастаноўку «Чалавек паміж Архангелам Міхаілам і сатаной».

«Эўрытмеум» — першы калектыў, які знаёміць нашага гледача з эўрытмічным мастацтвам. Праграма выступленняў тэатра вельмі разнастайная: у ёй паэзія і проза многіх стагоддзяў, класічная музыка і сачыненні вядомых сучасных кампазітараў. Кульмінацыяй кожнага прадстаўлення доўгі час былі сольныя выступленні мастацкага кіраўніка Эльзы Клінк. У Мінску Эльза выступала ў ролі правадніка ў свет эўрытміі. Але па-ранейшаму творчымі вяршынямі тэатра застаюцца яе поўныя экспрэсіі харэаграфічныя кампазіцыі, сола і ансамблі.

Першыя гастролі ў Саюзе, першае выступленне з Дзяржаўным камерным аркестрам БССР... Для «Эўрытмеума» многае ўпершыню. Тым больш нечаканасцей у Мінскага гледача, для якога знаёмства з эўрытміяй таксама першае. І не апошняе?

З. МАРАВА.

АРТ-ТЭЛЕТАЙП

Пачаў сваё існаванне новы ўсесаюзны часопіс «Мир звезд», каляровае ілюстраванае выданне «для ўсіх». Сярод «зорак» палітыкі, бізнесу і спорту на яго старонках будуць з'яўляцца і зоркі мастацтва.

* * *

Ленінградскае таварыства аматараў балета лічыць, што ЮНЕСКА будзе мець рацыю, калі аб'явіць 1993 год Годам Пеціпа. Менавіта тады славутаму майстру харэаграфіі споўніцца 175 гадоў.

* * *

У Ніёне (Швейцарыя) завяршыўся XXII Міжнародны кінафестываль — адзін з найбольш аўтарытэтных аглядаў неігравога кіно. Галоўны прыз — «Залаты сестэрцый» — атрымаў фільм «Ваш уходзячы аб'ект» Леанід Абаленскі» («Леннавукфільм», рэжысёр Юрый Захараў, сцэнарый Я. Цірдатавай і П. Чарняева, аператар У. Петухоў). Журы адзначыла: «Фільм расказвае пра жыццё акцёра і кінематаграфіста Абаленскага, які выступае як сведка і ўдзельнік эвалюцыі рускай культуры ў нашым стагоддзі».

ПРЭМ'ЕРА

«Дзе зямля ваша будзе?..»

Самая кароткая рэцэнзія на пастаноўку купалаўцаў «Тутэйшыя» была надрукавана ў «Свабодзе» (№ 11) і паведамляла, што акцёр Віктар Манаеў, выканаўца ролі Мікіты Зносака, купляючы «Вячэрні Мінск», сказаў: «Мне «Вечерку», пожалуйста».

Пакінем на сумленні аўтара гэты публічны данос, які ён, хай сабе і з іроніяй, у загалоўку назваў менавіта рэцэнзіяй. Нічога не зробіш — проста аўтару хочацца быць арыгіналам у кожным прамоўленым ці, тым больш, напісаным слове. Жаданне, трэба заўважыць, цалкам натуральнае. Як, дарэчы, і жаданне Манаева размаўляць тою моваю, якой ён сам захоча.

Неўзабаве пасля прэм'еры «Тутэйшых» сустрэў Віктара ў цэнтральнай кнігарні. Павіншаваў, паспачуваў, бо спадар «калежскі рэгістратар» меў вельмі стомлены выгляд. Усмешка ледзь слізганула па няголеным твары — маўляў, сам бачыў, як прыходзіцца працаваць на сцэне... Дарэчы, калі вышэйзгаданага рэцэнзента цікавіць падобная інфармацыя, то — калі ласка — Манаеў размаўляў па-беларуску і купіў не «Судьбу России» Бярдзяева, а «Беларускі каляндар».

«Нагаварыў бочку арыштантаў,— пасміхнецца чытач,— а нічога толкам не растлумачыў — якія «Тутэйшыя», які Манаеў, якая «Свабода», у рэшце рэшт.

Нагадаю. «Тутэйшыя» — трагікамедыя Янкі Купалы, напісаная ў далёкім 1922 годзе, з 1927 года не перадрукоўвалася. Некалькі не такіх ужо і даўніх выказванняў пра гэты твор савецкіх крытыкаў: «...нягледзячы на цікавасць самой тэмы, вырашана яна драматургам няўдала і палітычна няправільна. Памылковым у п'есе з'яўляецца і сама ацэнка падзей гэтага складанага і цяжкага перыяду ў жыцці беларускага народа, і сама трактоўка антыпода Зносака — настаўніка Янкі Здольніка, апанаванага нацыяналістычнымі ідэямі» (У. Карпаў «Па шляху сталасці»). «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» папракае Купалу ў «пэўнай хісткасці ідэйна творчых пазіцый». У энцыклапедычным даведніку «Янка Купала» абвінавачванні яшчэ больш суровыя...

Віктар Манаеў — акцёр купалаўскага тэатра, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі — бліскучы выканаўца адной з галоўных роляў у спектаклі. Калі на сцэне В. Манаеў, зала — сам быў таму сведкай — як бы не заўважае ўсіх астатніх. Нягледзячы на тое, што гэтыя астатнія — вядомыя А. Уладамірскі, М. Захарэвіч, У. Кін-Камінскі — гралі таксама выдатна. Адзін аўтарытэтны літаратура- і мастацтвазнаўца, які на працягу ўсяго спектакля захапляўся ігрой А. Сідаравай (Наста Пабягунская), вымушаны быў у рэшце рэшт прызнацца, што Манаеў на галаву вышэй за ўсіх.

Ну і, нарэшце. «Свабода» — незалежная беларуская газета, якая нядаўна стала легальнаю і прадаецца ў кіёсках «Саюздруку».

Колькі слоў пра пастаноўку Мікалая Пінігіна. Батлейка, на мой погляд, прыйшлася ў пару купалаўскай сцэне. Не парушылі купалаўскае канцэпцыі і рэжысёрскія ўстаўкі з белым і чорным анёламі (помніце:

У караўніцах амшалых
з галавы да ног
з дзікіх багнаў, перавалаў
выбрыў чорны бог).

Таксама і сімвалічныя сцэны з дзіцячай калыскай, калі над немаўляткам схіляюцца з розных бакоў польскі ксёндз і расейскі святар. Шэпчучы пацеры кожны на сваёй мове, яны як бы змагаюцца за дзіцячую душу. Згадайма зноў жа Купалу:

Прыйдуць людзі з Усходу,
прыйдуць з Захаду людзі
ды й спытаюцца нас:
— Скуль, якога вы роду,
дзе зямля ваша будзе,
дзе Айчызна у вас?

Цікавы і фінал. З ямы, куды пападалі забітыя героі, выпаўзае чырвонае палотнішча, даўжэзнай змяёй цягнецца да калыскі, абвівае яе. Але з'яўляюцца белыя анёлы з гэткімі ж доўгімі белымі стужкамі. Калыска падымаецца ўгору і над сцэнай — бел-чырвона-белы сцяг.

Эфектна?
Аптымістычна?
Усё.

М. СКОБЛА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

6 снежня
Заказ 2031.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.